№ 86 Ausgabe B.

ГОМАН

Цэна с перэсылкай і дастаукай да хаты: на 1 год—4 м. 80 фэн., на ½ году—2 м. 40 ф., на 3 месяцы—1 м. 20 ф., на 1 мес.—40 фэн.

Беларуская Віленская часопісь
выходзіць два разы у тыдзень: у аўторкі і пятніцы.

Адрэс рэдакції: Вільня, Завальная 7.
Адрэс адміністрації і экспэдыціі: М. Стэфанская 23.

Цэна абвестак: на 4-ай старане за радок дробнымі літэрамі—25 фэніг.; дробные абвесткі—па 5 фэн за слова. Абвесткі аб сьмерці—60 фэн. за лінейку дробн. друкам.

№ 86 (178). Год II. Вільня, 26 кастрычніка 1917 г. Цэна 5 фэн. (3 кап.).

Перад рэволюціей у Італії.

25 кастрычніка.

Заходні тэатр:

Фронт Рупрэхта Баварскаго: У Фляндрыі агонь крапчэйшы, чым звычайна, між морэм і возерам Блянкарт. Ад лэсу Гутгольст да Пашэндалю агонь у вечары дайшоў найсільнейшаго барабаннаго.

Фронт нямецкаго Насьледніка: Пры каналі Уаз-Эн агонь у вечары дайшоў вялікай сілы і не слабеў у начы.

Усходні тэатр:

Нічога асабліваго.

Італьянскі тэатр

Учора нямецкіе і аўстрыяцкіе войскі выступілі поплеч проці сваіх быўш. саюзьнікоў. Ужо многа разоў выпрабаваные дывізіі пасьля кароткаго агня прарвалі італьянскі фронт на Ізонцо ад Фліча да Тольмэйну на шырыні 30 кіл. Варожые пазыції, замыкаўшые даліны, былі узяты з аднаго удару. Сьнег і дождж задзержывалі рух упярод. Цьвёрды адпор італьянцоў быў зломлен вострай бітвай на штыкі. Опэрації развіваюцца далей. Да вечара ўзяты у палон больш за 10.000 італьянцоў, у тым ліку штабы дывізій і брыгад, і здабыта багатая дабыча ў гарматах і ваенных матэр'ялах.

ВЕНА. (В.Т.Б.). 24.X. Опэрації на Ізонцо трываюць далей удачна. Злучоные арміі выкінулі ворагоў з іх пярэдніх пазыцій на фронці 30 кіл. шырокім. Узяты некольці тысяч палонных і многа гармат.

ЛЮГАНО. Правая група і група цэнтру (82 дэпутаты) пастанавілі падаць у італьянскім парлямэнці голас проці міністэрства. Гэтым развязываецца пытаньне аб міністэрстве.

ЛЮГАНО. У італьянскім парлямэнці Гэнріко Фэрры заявіў, што ён спадзяецца дэмонстрації парлямэнту за мір, падобнай да маніфэстації нямецкаго парлямэнту. На жаль, саюзьнікі дагэтуль ешчэ не далі адказу на мірнае прэдлажэньне Папежа.

БЭРН. Амэрыканская соцыялістычная партыя пасьля выступленьня членаў яе, стаяўшых за вайну, цяпер ўжо цьвёрда стаіць за мір.

БЭРЛІН. (В.Т.Б.). Ля берагоў Англіі і ў Паўночным моры нямецкіе падводные лодкі ізноў затапілі 26.000 тонн.

ПЕЦЯРБУРГ. (П.Т.А.). Падгатавіцельны Парлямэнт. Ваенны міністэр, Вэрховской, адзначыў трываючий далей паход ворагоў у расейскіе землі. Аднак ворагі не надчыняць Расеі сваей волі, бо армія да канца будзе спаўняць сваю павіннасць. Одпуск рэкрутоў с 1895—1898 г. г. не аслабіць сілы арміі.

БЭРЛІН, 25.X. Паводлуг газэтных вестак, кандыдатура графа Тарноўскаго на міністра-прэзыдэнта Польшчы прынята.

У гасьцініцы „Адлон" адбылся устаноўчы сход нямецка-польскаго таварыства.

Пэўные ведамасьці аб нямецкай ваеннай пазыцэ.

Чы забаспечэна ліквідація ваеннай пазыкі без страт?

1. Ужо цяпер аддзелам імперскаго банку загадано у кожнаго падпісчыка на ваенную пазыку, каторы прымушэн прадаць свае паперы дзеля гаспадарскіх патрэб, купляць іх на суму да 1000 м. па надпісной цане 98%.

2. Аб кроках пасьля вайны галава імперскаго банку недаўна сказаў:

Пазычковые кассы, бязспорна, астануцца ешчэ на рад гадоў—я думаю, найменш 4—5, і будуць адкрыты дзеля прыём у пазычковых папероў. Але гетаго ім будзе мала. У вельмі чысьленых прыпадках с прычыны вялікіх выдаткоў валадзельцы будуць прымушэны свае паперы ваеннай пазыкі абярнуць, прадаючы, у грошы, каторые пойдуць на куплю сырцоў, варштатоў і інш. З гэтай прычыны зусім справядліва, што ў першые гады пасьля замірэньня на рынак будуць кінуты паперы на вялізарные суммы ваеннай пазыкі—цэлые мільярды. Імперскім і агульнымі нямецкімі банкамі будуць учынены крокі,—я на гэта спадзяюся і жадаю гэтаго—і з іх падмогай пазычковые кассы дадуць капіталы, каб узяць кінутые на рынак паперы.

Я зусім не сумляваюся, што гэта праграма паложыць пэўную загарадзь перад небаспекай упадку курсу ад непамернай падачы папероў.

Да нашай краёвай інтэлігэнціі.

(Адкрытае пісьмо).

Пісьмо гэтае прыслано нам вядомым прэдстаўнікам вялікіх земляўласьнікоў, п. Казімірам Шафнаглем с Купляп, ашмянскаго пав., каторы ўсё свае жыцьцё стаяў на шчыра краёвым становішчы, як сын зямлі Беларускай, а цяпер, калі настаў момэнт дзеля чыннаго выступленьня беларускаго народу, приступіў да беларускай нацыянальнай работы, як беларус.

Пісьмо гэтае мае выйсьці у асобнай адбітцэ такжэ і ў польскім перакладзе.

Рэдакція.

Прыйшоў момэнт ядыны, момэнт асаблівы, момэнт, каторы мо' ужо ў гісторыі не паўторыцца больш дзя нешчасьліваго, пазбаўленаго сваей дзержаўнасьці, пакінутаго сваімі натуральнымі кіраўнікамі—сваім духавенствам і сваей сьвецкай інтэлігенціей беларускаго народу. Гэты народ беларускі прызван цяпер сам пастанавіць аб сабе, аб сваей будучыне, прызван паказаць, што ён ёсць, падаць голас, што ён жыве, выказаць свае палітычные і нацыональные жаданьня.

Але які-ж страшэнны трагізм! Гэты народ беларускі, каторы, як і кожын іншы народ, павінен скла дацца з некольких грамадзянскіх слаёў: народнай масы—селянства і работнікоў, ды с кляс менш чысьленых, але экономічна і культурна сільных і нацыональна сьвядомых,—значыць: земян, мешчанства і прэдстаўнікоў вольных прафэсій,—гэты народ беларускі складаецца цяпер толькі с чысьленай, але цёмнай, неграматнай, нацыональна несьвядомай селянскай і работніцкай массы, баламучэнай па сягоньняшні дзень панующымі над ей палітычна, экономічна і культурна нацыональнасьцямі. Бо гэты народ беларускі—то сірата, бедны, цёмны, беззашчытны, сірата, пакінуты сваімі натуральнымі айцамі і апякунамі—сваей інтэлігэнціей. І вось, калі наляцела страшэнная гісторычная навальніца, калі прагавітасць суседзяў шчэрыць зубы, каб праглынуць і сцерці да званьня з абліча зямлі народ беларускі, калі разам с тым —дзякуючы шчасьліваму ходу здарэньнёў—гэтаму народу засьвяціўся, праўда, слабы ешчэ прамень надзеі на нацыональнае і палітычнае адраджэньне, — у гэткі становішчы зваротны момэнт той народ—сірата стаіць вось беззашчытны, бытцым смачная пажыва для кожнаго, хто захочэ прагнуць па яго руку, каб яго зьнішчыць, дэнацыоналізаваць, праглынуць!

Где-ж запрапала тая натуральная апякунка і кіраўнічка кожнаго народу — яго інтэлігэнція? Якім даўным, трагічным здарэньнем асталося ад народу гэтаго толькі тулаво, — і дзе падзелася галава яго?

Ах, бо інтэлігэнція гэтаго народу некалі за сорак сярэбранікоў (шляхоцкіе прывілеі—падданство селян) адраклася яго, здрадзіла свой уласны народ, прысвоіўшы чужую для яго мову, культуру і палітычны ідэал. Беларускі народ і стаўся гэтак сіратой, бо яго інтэлігэнція, яго вышэйшые, абаспечэные клясы дэнацыяналізаваліся,спольшчыліся, сталіся чужымі тэй массе народнай, с катораЙ выйшлі, чужымі тэй зямлі, з якой ад вякоў цягнулі жыцьцёвые сокі.

Раз пачаўшыйся раздзел вызываў усё вялікшые рэзультаты, паглыбляўшые ўсё болей пропасць між народам беларускім і яго апалячэнай інтэлігэнціей, бо беларуская масса, пазбаўленая сваіх уласных, нацыональных культурных слаёў, асталася на пачатковай ступені развіцьця са сваім „простым“—як у пакорнасьці свaей называе—языком, са сваей нацыональнай несьвядомасьцю, каторая выяўляецца, напрыклад, у тым, што беларус ня ведае, хто ён папраўдзі ёсць і на пытаньне аб гэта, калі каталік, кажэ: „польскі“ а калі праваслаўны—„рускі“, не маючы магчымасьці распазнаць гэтых двух аснаўных паняцьцёў—вера і нацыональнасць, бо утраціў нават жаданьне мець сваю гасударственасць і нацыональную самабытнасць.

Інтэлігэнція беларускаго народу—яго „абыватэлі“, духавенство і мешчанство, прысвоіўшы сабе чужую, але багатую польскую культуру з яе пышнымі здабыткамі, традыціямі, літэратурай і ідэаламі, каторые зіхацяць тысячамі колероў, вабючы вочы, душу і сэрцэ, і ўлажыўшы ў скарбніцу гэтай чужой культуры багатые ўласные здабыткі, паклаўшы на жэртвены алтар польшчыны найвышэйшые праявы свайго нацыональнаго генія (Міцкевіч, Кондратовіч, Косьцюшко, Ожэшкова, Монюшко, Сенкевіч і т. д.), даўшы польскаму народу папраўдзі львіную часць таго, чым палякі пышаюцца, як сваім найвялікшым і найхарашэйшым багацьцем,—гэтая апалячэная беларуская інтэлігэнція цяпер с пагардай пагледае на народ, с катораго сама выйшла, зусім, як той мужык, каторы дайшоў багацьця, пабудаваў на мейсцы бацькавай хацінкі палац, апрануўся ў багатые шаты, набраўся „панскіх“ манер—і сароміцца свайго селянскаго роду, с пагардай глядзіць на тых бедных братоў сваіх, каторые ў мужыцкай хаці асталіся, ды йшчэ горш і страшней: ужо іх за братоў ня лічыць, вырэкаецца іх і супольнаго з імі паходжэньня..

А ты, пане, каторы ад дзядоў-прадзядоў жывеш тут, у Беларусі, маеш беларускае імя, або хоць і польскае, ці спольшчэнае, дык усё роўна чысьленымі вузламі крыві ад вякоў звязан с тутэйшым народам і з гэтай зямлі роднай, з гэтаго краю — такога блізкаго, з яго палёў, пожней і лясоў і паветра свае сокі жыцьцёвые цягнеш,—ты, пане, каторы ад дзядоў-прадзядоў жывеш у найбліжэйшым суседзтві з гэтым народам і с працы яго здабываеш сваё багацьце,—ты, да каторага люд гэты гэтак шчыра, гэтак міла, па сыноўску пешчатліва прамаўляе: панок, паночак, бытцым мімаволі шукаючы ў „пану“ апякуна, айца,—ты, пане, на пытаньне, хто ты такі?—адказываеш: „Я? Я—паляк!“ Так, горда, пышна, сьвядома: паляк! Божэ, крый, беларус: „фэ, гэта выходзіць па-хамску, так компромітуе, так нязгодліва з маімі традыціямі, ідэаламі і мінуўшчынай!“

Вось, у чым трагізм палажэньня: беларускі народ, праўда, мае сваю інтэлігэнцію, ды яна—польская!

Два асобные сьветы, дзьве мовы, дзьве традыціі, два сьветапагляды, — дзьве ор'ентаціі!

А трагізм палаженьня узвялічываецца яшчэ тым, што і мейсцовае духавенство, радзіўшаес ў гэтым краю, часта выйшаўшае безпасрэдна з беларускай массы або са спольшчэнай шляхты беларускай, часта с чыстым беларускім імем, чураецца гэтаго народу. На пытаньне: хто ты? — ксёндз адказвае: „Я чую сябе палякам...“

І вось бедны селянін беларускі ані ў сваім „панку“, ані у ксяндзу не бачыць ужо брата. Пан і ксёндз прамаўляюць да яго не ў яго роднай „простай“ мове, а языком „панскім“, культурным, языком польскім. Пан і ксёндз лічаць, што іх найсьвяцейшая нацыональная павіннасць — апалячыць беларуса-мужыка праз касьцёл, праз школу, калі-б удалося — дык праз суд, праз урадовые установы, а ў канцы, як найвышэйшы ідэал, праз дзержаўнасць... польскую!

Чым жэ вы, апалячэные беларусы, лепшые за пагарджаных вамі гакатыстоў і абрусціелёў? Адумайцеся! Чы не ў сто разоў горшы вы за іх, чы не заслугоўваеце на імя адступнікоў свайго народу?! Бо калі гакатысты і абрусіцелі прыходзяць, маючы ўласць, с чужой зямлі дзеля дэнацыяналізаціі таго або іншаго народу, дык яны за гэта прыносяць ям у доступ да вялізарных карысьцей, каторые дэнацыоналізованым дае прыналежнасць да палітычна ці культурна магутных дзержаўных організмоў. — А вы, апалячэные беларусы, вы—адступнікі ў родчым краю, у краю, дзе вы узгадаваны, дзе жывецё—адступнікі, бо хочэце пазбавіць народ свой яго нацыональнасьці, хочэце навязаць яму чужую гасударственасць — замест памагчы яму стварыць сваю ўласную, накінуць яму чужую мову, каторая сталася для вас радзімай...

(далей будзе).

З жыцьця у Расеі.

Украінцы.

(гл. № 85).

Бачучы гэткае палажэньне, расейскі часовы ўрад (правіцельство) каб зрабіць згоду з украінцамі, паслаў да Украінскай Цэнтральнай Рады ў Кіеў міністраў Тэрэшчэнку і Цэрэтэлі.

Гэтые два міністры зрабілі умову з Украінскай Цэнтр. Радай. Па г[illegible] умове Украіна прызнава[illegible] аўтаномнай у сваіх этнографічных граніцах. Украінскі генеральны сэкрэтарыат, выбраны Цэнтральнай Радай, папоўненай прэдстаўнікамі нацыональных меншасьцей, прызнаваўся вышэйшай ўласьцю на Украіне і ўсе зносіны розных інстытуцій на Украіне с цэнтральным расейскім урадам павінны былі адбывацца церав генеральны сэкратарыат. Члены сэкратарыату назначаліся за генеральных сэкрэтароў (уркаінскіх міністроў) асьветы, землеробства, дарог, почт і тэлеграфоў, еміных спраў і іншых.

Ня ўсім генеральным сэкратаром прызнавалася поўная ўласць. Гэтак, генеральнаму сэкратару асьветы прызнана была ўся ўласць, а ген. сэкратаром дарог, почт і тэлеграфоў дана толькі магчымасць гатавацца да прыняцьця гэтых установ у той час, калі аўтаномія Украіны будзе прызнана Расейскай установчай зборняй.

У. Ц. Р. у гэнай умове прыстала на тое, што Расейская установчая зборня пастановіць, якой шырыні мае быць аўтаномія Украіны[1]).

Гэная умова не здаволіла кадэтаў. Яны і думаць не хацелі аб тым, каб даць украінцам аўтаномію. С прычыны гэнае умовы кадэты вышлі с часоваго ўраду.

Умовай часоваго ураду з Укр. Цэнтр. Радай пастаноўлено было, што часовы урад выдасць інструкцію аб аўтаноміі Украіны, а У. Ц. Р. — новы унівэрсал да украінскаго народу. Тымчасам у новы ўрад увайшло кадэтаў больш, чым было раней, і гэты новы урад выдаў інструкцію, зусім нязгодную з умовай.

Гэтай інструкціей за Украінай прызнаваліся толькі пяць губэрній: Кіеўская, Палтаўская, Валынская, Падольская і Чарнігаўская без паветоў Старадубскаго, Новозыбкоўскаго і Городнянскаго. У інструкціі было сказано, што іншые украінскіе губэрні або часьці іх могуць быць прылучаны да аўтаномнай Украіны, калі іх земствы гэтаго зажадаюць. Генеральные сэкрэтары дарог, почт і тэлеграфоў і еміных спраў не былі прызнаны, зменшалася компэтэнція ваеннаго сэкрэтара; больш правоў давалося не украінцам у генеральным сэкрэтарыяце.

Быў момэнт, што с прычыны гэтае інструкціі Украіна за малым ізноў не парвала с часовым урадам.

Як несправядлівы жаданьня часоваго ўраду, можна бачыць с таго, што інструкція прызнана была несправядлівай і шкоднай для згоднаго жыцьця народаў Расеі ня толькі членамі Ц. Рады украінцамі, але і ўсімі членамі Ц. Рады і Г. Сэкрэтарыяту, прыналежачымі да нацыональных меншасьцей. Нацыональные меншасьці адмовілі ся ад правоў, так ласкава дадзеных ім часовым урадам, і больш, чым ся раней, месц у Генеральным сэкрэтарыяце не ўзялі.

Пасьля гэтай інструкціі у жніўні месяцы губэрскіе земствы, і селянскіе з'езды губэрній Екацерынаслаўскай і Харкаўскай пастанавілі прылучыцца да аўтаномнай Украіны.

Украінцы жадаюць, каб апрача губ. Екацерынаслаўскай і Харкаўскай яшчэ былі прылучэны да аў-

[1]) Украінцы жадаюць аўтаноміі с сваім войскам, манэтай і мытнымі граніцамі ад рэшты Расеі.

Беларускіе легенды.

Начэпнасць.

(Гл. «Гоман» № 85).

С таго часу ніхто з ім гукаць не хацеў, усе баяліся, нават яго таварышы і тые уцікалі ад яго.

Даведаліся аб гэтым і пан з аканомам. Яны ня верылі гэтаму, і як раз у дварэ пан папытаўся самога Васіля, ці гэта праўда, што кажуць, Васіль адказаў: „Гэным дурным людзём заўсёды штось прысьніцца, абы малоць языком“, і пан даў спакой.

Антон, добры чэлавек, стараўся яго паправіць, змушаў ходзіць да царквы і маліцца; ён сьмеяўся з усяго, усім грэбаваў і ішоў у карчму замест на набожэнства.

Напасьледак ён пастанавіў ажаніцца. Антон думаў, што добрая жонка і змена ў жыцьці паправіць яго. Пасылаў сватоў ня тыкеля[1]) ў сваю, але і ў чужую воласць; але ўсюды адказывалі, бо пагаласка аб благіх яго звычаях далёка разышлася.

Васіль грэбаваў усімі і сьмеяўся з усяго, кажучы, што ён ужо даўно выбраў сабе жонку. Перш не хацеў аб гэтым гукаць, а цяпер кажэ ўсім, што любіць Алюту, дачку Арыны, і што абецаў з ёй жаніцца.

Пачуўшы аб гэтым, Антон быў вельмі знемарашчэны і радзіў яму даць супакой з Алютай, бо аб Арыні кажуць, што яна благая кабета і чараўніца, а яблык ад яблыні недалёка коціцца, дык мо' і дачка будзе такой, але нічога не памагало і Васіль яшчэ часьцей стаў хадзіць да Арынавых.

Суседзі, гледзючы на гэту прывязьлівасць да Алюты, адны сьмяючыся казалі: „Роўны роўнаго пазнаў, будзе дабраная пара“. Другіе хвалілі, што Алюта будзе добрая жонка, што не ўдалася ў матку. Былі і такіе, каторые казалі, што любоў яго непраўдзівая, што яму дадзено нечаго выпіць і ён хоць сябрує с чартом, напаў ан лепшую і яго ачаравалі.

Антон доўга адраджаў яму жаніцца з Алютай, урэшці настрашыў, што ня прыме ў хату і не паможэ сесьці на гаспадарку.

— Не прашу я нічыей помачы, адказаў Васіль, я дастану грошы. Гэткі апякун, як ты, мо' сам прыдзе калі да мяне прасіць падмогі.

Антон пайшоў да кума Марціна. Гэта быў чэлавэк разумны і гаманкі, рады кожнаму парадзіць і памагчы, дзеля гэтаго яго ўся воласць любіла. Ен абецаў умовіць Васіля кінуць Алюту.

Як пачуў Васіль ад апякуна, што ня будзе мець ніякае падмогі, пастанавіў шукаці скарбаў, хоцьбы яны былі заклятые або ў чартоўскіх руках. Ад вёскі, ў каторай ён жыў, у адступі дзьвёх вёрст, быў узгорак ля дарогі, на ім ляжаў вялізны *Вужоў Камень*. Старые людзі гэтак аб ім расказывалі.

Раз, у летку, ў ціхую пагодлівую ноч ляцеў агнём шыбаючы вуж с поўначы на паўдня, як бы нясучы с сабой многа золата і срыбра грэшніку, каторы чарту душу запісаў. Бачылі гэта дарожнікі і нальле, ідучы с прыгону. Раптам адчынілося неба, сьветласць вялікая разлілася, людзі молючыся валюцца на зямлю, а Вуж выцяты нябэснымі косамі[1]) валіцца на ўзгорак і перэварачываецца ў камень. Скарбыж залота і срыбра, што нёс с сабой, тамжэ на месцы самі закапаліся ў зямлю і с таго часу з'яўляліся па розных месцох узгорка у розных пастацях. Адны бачылі плачку на камені, каторая выцірала сабе сьлёзы насаткай, палаючай агнём, другіе позна ідучы дарогай углядалі карлюкоў чорных і таўстых, як бочка; іншым з'яўляліся чорные казлы, каторые з зямлі скікалі на камень, а с каменя на зямлю, і шмат іншых дзівотаў.

Гукалі яшчэ, што калі хто асьмеліцца ля Вужова Каменя начаваці, той дастане гэные скарбы. Васіль быў адважны, не баяўся страхацьцёў, бо ўжо раз с чартом, што ехаў на віхры прывітаўся як с сябром.

Па заходзе сонца, як зьмеркла, ідзе на узгорак і сядае на камяні; хмары зацягнулі неба, што раз цямней у полі, ўсюды глуха, ў лесі, што чарнеў перад ім, крычалі совы.

[1]) Тыкеля—толькі.

[1]) Праменямі.

таномнай Украіны губ. Хэрсонская часьці Чорнаморскай, дзе жывуць казакі — украінцы і Бессарабскай, губ. Хоцінскі павет, дзе так сама жывуць украінцы.

Усе гэтые землі злучэны з Украінай ня толькі этнографічна, але і гістарычна, і украінцы маюць сьвятое права мець іх у „вольнай Украіне“.

Янучонак.

У Вільні і ваколіцах.

× **Беларускі тэатр.** Пасьля летняго перарыву беларуская драматычная дружына, папоўненая сьвежымі сіламі, зноў прыступіла да працы. На сцэні Беларускаго Клюбу пачаліся пробы новай п'есы Ф. Олехновіча п. н. „Калісь“.

Рэч дзеецца не так даўно, у многіх ешчэ жыва стаяць у памяці гэтыэ часы... «Калісь»—гэта тады, як першы раз зварушыліся па ўсей Расеі масы рабочаго люду, як голасным пратэстам проціў старога ладу пеялі на вуліцах „Чырвоны штандар“ або работніцкую „Марсыльезу“, калі ўсё маладое, шчырае, моцнае абнято было адным рэвалюцыйным агнём, а „свышэ“ раздаваўся прыказ: «патронаў не жалець, халастых залпоў не даваць!“...

„Калісь“—гэта драматычны абразок тэй недаўнай мінуўшчыны—с 1905—6 г.г.

Усё гэта прайшло і мусіць ужо ня вернецца. Німа ўжо ў Расеі царскаго ураду, німа забароны арганізацііі сьвядомаго пролетарыату, німа ўжо шмат сьведкаў першай рэвалюціі: асталіся толькі ўспамінкі, крывавые ўспамінкі, бо колер гэтых часоў быў... чырвоны...

× **У Беларускім Клюбе.** Каб нядзельные лекціі для членаў Клюбу і муз.-драматычнаго гуртка вясьці паводлуг пляну, сыстэматычна, на апошнім заседаньні рады старшын выбрана спэцыяльная лекціонная камісія.

У гэту нядзелю, як і ў мінуўшые, адбудзецца чародная лекція а $^1/_2$4 гадз. паабедзі.

У вечары ў суботу і ў нядзелю —звычайные вечарынкі толькі для членаў клюбу, гуртка і запрошэных гасьцей.

× **Грамадзянскі Угодлівы Суд.** На супэрарбітра суда замест памершаго М. Вэнслаўскаго выбран прысяжны адвакат, Ян Буйко.

Заседаньня суда ў найбліжэйшым часі маюць быць перанесены ў новае памешчэньне — Віленская вул. 23, главны ўход, гаспода Саюза Дамаўласьнікоў (некалі Грамадзянскаго Камітэту).

× **Скорая помач** у прошлым тыдні (15—21.X.) дадзена ў 72 прыпадках, у тым ліку 41 выезд каратки і 31 раз помач дадзена на станціі.

× **Кепскі пачастунак.** Гаспадар д. № 2 на 3—кай вул. даў старожысе дому, Констанціі Шаўлоўскай, міскы зупу. Кабеціна паела і накарміла сваіх чацьвёра дзяцей. Раптам пад вечар ўсе еўшые зупу захварэлі ад атручэньня. Адратаваў іх дохтар скорай помачы.

× **Тэмпэратура.** Найвышэйшая і найніжэйшая тэмпэратура за апошніе дні была (па Цэльсію):

	найвыш	найніж.
21—22	+ 9°	— 1°
22—23	+ 9°	+ 1°
23—24	+ 7°	+ 2°

БІБЛІОГРАФІЯ.

«Das Land Ober Ost» («Землі Обэр Ост»). Пад гэтым загалоўкам Presse-Abteilung пры Главнакамандуючым на ўсходзі выдало кнігу, каторая на сваіх 488 страніцах стараецца даць жыхаром Нямеччыны апісаньне Курляндзіі, Літвы і занятай немцамі часьці Беларусі. У кніжцы 36 рысункоў і 3 карты. Каштуе яна ў аблоўжцы 6 м.

З усяго Краю.

ГРОДНЯ. Упраўленьне места падвоіло плату за старую паперу і за пуд яе выдае 1 фунт цукру.

Адзін тутэйшы жыхар атрымаў ад местоваго ураду вялікую партыю аўса дзеля вырабу аўсянкі. Аднак, выробленая ім аўсянка была вельмі благая, бо ў ёй як-раз найменш аказалося аўса. «Фабрыканту» прыдзецца вярнуць вартасць узятаго аўса.

БАРАНАВІЧЫ (пад Гродняй). У аднаго с тутэйшых жыхароў згарэло гумно з вялікім запасам жыта і ячменю.

НАВАСЕЛКІ. У начы с 17 на 18 кастр. тут укралі каня і карову. Пры гэтым былі выламаны дзьверы.

БЕЛАСТОК. Пазычковая касса Остбанку, каторая, як ведама, выпускае „нямецкіе рублі“, перавезена ў Коўну.

ЗАБЛУДОВО. У Беластоку трое хлапцоў укралі нэдаўна каня і перэпрадалі сюды. Калі гаспадар украдзенаго каня пасуліў 100 руб. нагарады таму, хто пакажэ на вінавайцоў, дык купіўшый у хлапцоў каня гвалтам павёў да абакрадзенаго аднаго с хлапцоў і зажадаў нагараду. На пытаньне, дзе конь, ён сказаў, што пасьпеў перэпрадаць яго ў Польшчу. Пры далейшых досьледах выкрылі, што і там конь за адзін тыдзень змяніў ужо пяць ці шэсць гаспадароў.

ЗАГАРАНЫ, алекшыцкаго пав. Селянін П. аддаў стэльмаху Віселіку матэр'ял на два колы. Калі колы былі ўжо закончэны, ён у начы залез да стэльмаха, украў колы і мех пшаніцы, каторую перэпрадаў у Лунну. П. засуджэн на 8 м. у вастрог.

ЖУКОВІЧЫ, алекшыцкаго пав. Трое работнікоў з работнаго батальёну залезлі ў хату селяніна Клебана і пакралі палатно, кашулі і 50 руб. грашмі. Зладзеі засуджэны на 5, 3 і 2 мес. у вастрог.

ПАПІШКІ, владыслав. пав. Браты Сімокайтіс патайна перайшлі церас граніцу і ў Тульпэнінгсах (у усходніх Прусах) абакралі, ўламаўшыся, купца Лемана. У іх рукі папалі запасы ботаў, сукна і т. п. За гэту «гастроль» Іонас, як рэцыдывіст, засуджэн у папраўчы вастрог на 2 гады 9 мес., а яго брат Міхал, каторы дагэтуль не судзіўся, толькі на 150 руб. штрафу.

АРЭНСБУРГ (на Эзэлі) За губэрнатара острава Эзэля назначэн барон ф. Зэккендорф, б. этапны інспэктар у Беластоку.

МІТАВА. Сюды прыехалі обэр-прэзыдэнт Усходніх Прусаў і прэзыдэнт (губэрнатар) Каралеўца. Яны пабывалі ў Рызе, дзе знаёміліся с палажэньнем. У тутэйшым казіно ім прэдстаўляліся прэдстаўнікі прыбалтыцкаго грамадзянства.

РЫГА. У пратэстанцкай катэдры ёсць надпіс, у каторым гаворыцца, што нейкая Магдалена фон Рэйн дажыла тут 120 гадоў і мела 76 дзяцей і ўнукоў. Наагул, у гэтым краю глыбокіе старцы — ня рэдкі. Ня толькі ў Курляндзіі, але і ў Літве можна часта сустрэціць вельмі пажылых людзей.

РЫГА. Офіцыяльнае расейскае апавешчэньне с 15 ліпня гэтаго году дае гэткі 'сп с цэн за май 1915, 1916 і 1917 году за расейскі фунт:

	1915	1916	1917
Жітняя мука .	4 к.	8 к	30 к.
Пшонная мука	15 „	30 „	100 „
Жітні хлеб . .	5 „	9 „	50 „
Ялавічына . .	30 „	85 „	160 „
Сьвініна . . .	40 „	65 „	275 „
Каніна	15 „	22 „	68 „
Саланіна . . .	90 „	150 „	300 „

Вестці з Расеі.

ПЕЦЯРБУРГ. **Падгатавіцельны парлямэнт.** Керэнскій заявіў, што тымчасовы ўрад да адкрыцьця установчаго сэйму павінен бараніць дадзеную яму ўласць ад уселякіх пакушэньнёў. На урад узложэны дзьве незвычайна цяжкіе задачы: зашчыта старонкі і аднаўленьне баевой сілы арміі. На ладжэнай конфэрэнціі саюзьнікоў расейскіе дэтутаты будуць бараніць годнасць і інтэрэсы Расеі. „Ад імі арміі я заяўляю, што справа страваваньня фронту становіцца ўсё больш і больш важкай у справе будучыны бацькаўшчыны“.

ШТОКГОЛЬМ. Як даносяць газэты, фінляндзкіе соцыялісты, у прыпадку непадатлівасьці сэнату, маняцца утварыць соцыялістычны ўрад. Па ўсей Фінляндзіі організуецца „чырвоная гвардзія“.

З усяго сьвету.

БЭРН. У італьянскім парлямэнці соцыяліст Модільяні зажадаў одпуска да хаты для салдатоў, радзіўшыхся ў 1874 і 1875 г. г.

Соцыялісты трэбавалі той-час разглядзець 34 пададзеные запросы.

ЦЮРЫХ. У Мілане і Вэнэціі узняліся новые сур'ёзные разрухі с прычыны недастачы спажыўных прадуктоў.

У некаторых местох пануе голад. Вельмі сумлеваюцца, чы Італія здалее далей ваеваць, асабліва с прычыны таго, што вайны ніхто ня хочэ.

БАЗЭЛЬ. У Глязго (ў Шотляндзіі) с прычыны труднасьці страваваньня узняліся вялікіе разрухі з учасьцем кінуўшых работу работнікоў.

ЛОНДОН. Англіцкі ўрад загадаў зачыніць усе саюзы сінн-фэйнэроў.

Васіль бачыць: перад ім паўзуць сыкаючы вужакі с каменя і скачуць каля страшка с сабачымі галавамі на казіных нагах. Васіль сьмела пазірае на гэта, думаючы, што зара яму пакажуцца скарбы; раптам бачыць, што хтось звярнуў з дарогі і падыходзіць. Гэта быў Марцін.

— Што тут робіш, папытаўся з усьмешкай, пэўня скарбаў шукаеш?

— Але, скарбаў, але чаго ты сюды прыйшоў? перашкодзіў мне, вырваў з рук маіх шчасьце; варта, каб ты галаву каменям рашчапіў.

— Не сярдуй, скажу тэ аб лепшых скарбах,—і сеўшы пры ім на камені,—„слухай, кажэ, Васілю, лепей ідзі дамоў, здароўе, праца, гэта найдаражэйшы для чэлавека скарб; блага хто шукае чартовае помочы. Антон, апякун твой, бяздзетны, калі будзеш паслухмяны, ўсё, што мае, табе аддасць.

Васіль засердаваны плюнуў і мурмочучы адышоўся.

С таго часу ён не прыходзіў дамоў. Антон, бачучы, што-раз вялікшую артачнасць, даў спакой і супакойна ждаў, што з гэтаго выйдзе. Знаёмые прыносілі розные весткі аб Васілю. Адны казалі, што знайшоў хэўру нейкіх бадзяк, крадзе з імі, збірае грошы і прапівае ў карчме; другіе, што жывучы ў Арыны вучыцца чараваць, і нават бачылі, як з Алютай і Арынай хадзіў па лесі і дрыгве, каля вазёр, збіраючы зельлі на каторых ніколі раса не абсыхае [1]); іншые казалі, з за куста нават чулі, як Арына, вырваўшы з зямлі якісь мох, расказывала яго страшную сілу.

Раз у нядзелю вечарам гэты з знаёмым, гэны с кумам ідуць у карчму, каб там пры гарэлцы пазюкаці, парадзіцца аб тым і сім і вясёла час скаратаць. Ідзе туды і Марцін, думаючы. што можэ стрэняцца з Васілём.

Сідзець за сталом. Жыд Іосель рады госьцям, налівае гарэлкі, ставіць на стол і крэйдай запісывае на сьцяне, ўмаўляючыся, што як прыдзе восень і будзе новы хлеб, дык ён прыедзе да іх, пачастуе гарэлкай гаспадара і гаспадыню, а яны будуць знаццa на ветласьці і не пашкадуюць рознаго збожжа.

Увайходзіць Марцін. Некаторые радые, што яго ўбачылі, садзяць за стол, частуюць гарэлкай; пачалася гутарка аб Васілю і яго прынадзе. Некаторые хвалілі Алюту, што добрая дзяўчына і былаб добрая жонка, каб выйшла замуж за добраго чэлавека, але не за Васіля, каторы пасябраваў с чартом. Было некалькі п'яных, што і Васіля хвалілі; іншые-ж Васіля, Алюту і Арыну звалі нягоднымі людзьмі.

Як гэтак гуканьне зацягіваецца, жыд Іосель, стоючы ля канца стала—„Паслухайце, кажэ, несправядліва кажэце аб Васілю, —Васіль добры чэлавек, як прыдзе с таварышамі да мяне, то заўсёды заплаціць, і заўсёды мае грошы, Алюта ай Алюта пазорная [1]) дзяўчына, калі ўбярэцца, дык як паненка ўсё поўна, ды і ў Арыны я нічога благога не бачў,—ну што чаруе, яна чаруе на тое, каб мець грошы, а грошы вельмі патрэбные кожнаму чэлавеку; яна і памагае, лечыць травой людзей.

Як гэтак гукаюць, шыбка адчыняюцца дзьверы, увайходзіць Васіль з задзёртай галавой, шапка на бок, з ім некалькі таварышаў; ўбачыўшы Марціна, ён нахмурыўся.


— Здароў Васілю! — кажэ Іосель — я даўно цябе не бачыў, ужо трэйці дзень, я і мая Сора думалі, што з ім, і цяперачка тыкеля што з людзьмі гукаў аб табе.

— Я ведаю, што людзі абамне кажуць, вецер носіць, не гляжу я на гэта. Сеў на лаві і локцямі абапёршыся на стол, крычыць: „Дай нам гарэлкі, але добрае“.

— А можэ Васілю даць салодкае гарэлкі, я прывёз з места, хоць яна дарагая.

— Дай дарагое—і кідае некалькі грыўняў на стол. Жыд як га падае шкалік і бутэльку гарэлкі.

(Далей будзе).



[1]) Трава *росічка*, расьце на купінах і ўжываецца проці чароў

1) Пекная.

БЭРН. Аб меры забастовачнага руху у Злучэных Штатах гавораць гэткіе цыфры: у Сан-Франціско бастуюць 30.000 мэталістоў, у Портляндзі (Орэгон)—4.000 работнікоў на верфі і 3,000 работнікоў па дрэві і т. д.

БЭРЛІН. (В.Т.Б). Усе соцыяльные і экономічные справы Нямеччыны будуць аддадзены новаму імперскаму ураду „Reichwirtschaftsamt". За першаго статс-сэкрэтара гэтаго ураду назначэн Швандэр.

ТЭЛЕГРАМЫ.

Нямецкіе апавешчэньня:

23. X. Заходні тэатр:

Фронт Рупрэхта Баварскаго: Бітвы у Фляндрыі між Драэйбанк і Пэлькапэль трывалі да вечара. На палудзенным краю леса Гутгольст ворагі глыбей урэзаліся ў наш зашчытны пояс, але былі адбіты контратакай і удзержаліся толькі на адрэзку 1.200 мэтроў шырокім найбольш на 300 м. у глыб. Сільные англіцкіе штурмы пры Пэлькапэль адбіты. Англіцкіе штурмы вялізарнымі массамі наабапол Гелюольт зломлены, нідзе не дайшоўшы да нашых загарадзей. Французы і англічане пад нашым сконцэнтрован. агнём мелі вялікіе крывавые страты і утрацілі палонных. Гэтак учора ў баталіі у Фляндрыі мы дайшлі поўнай удачы.

Фронт нямецкаго Насьледніка: Артылерыйская бітва на поўначы ад Суассон ад поўдня ішла поўным ходам і дайшла найвялікшай сілы у вечары між далінай Айет і Брэ. Пасьля яна аслабела, але каля поўначы пачала ізноў крапчэць, дайшоўшы барабаннаго агня. У досьвітках пачаліся францускіе штурмы, і гэтак узнялася пешая баталія.

На ўсходнім беразі Маасу мы штурмам адабралі вяршыну 326, на заходзі ад Бомон, узяўшы больш за 100 палонных.

Усходні тэатр:

На астравох Рыжскай затокі ўзято усяго: 20.130 палонных, больш за 100 гармат, у тым ліку 47 цяжкіх з броненосцаў, 150 кулемётаў і мінаметаў, больш за 1.200 вазоў, каля 2.000 каней, 30 самаходаў, 10 самалётаў, 3 урадовые кассы с 365.000 руб., вялікі запас прадуктоў і ваенных матэр'ялоў.

Між Балтыцкім і Чорным морам—без перамен.

24. X. Заходні тэатр:

Фронт Рупрэхта Баварскаго: У Фляндрыі нашы войскі контр-атакай выкінулі ворагоў бліжка зусім з нашаго зашчытнаго пояса, дзе ім удалося ўварвацца ў часі апошняй бітвы ў лесі Гутгольст. Ад Драэйбанк да Зандвордэ агонь у начы ізноў крапчэў.

Фронт нямецкаго Насьледніка: Французы ўчора пачалі вялікае наступленьне ад даліны Айет, на поўначы ад Воксэйён, да плоскагорыя на поўначы ад Пэссі (25 кіл). На поўдні ад каналу Уаз Эн, між Айет і вяршынамі Остэль, перад абедам ішлі цяжкіе, с пераменным шчасьцем бітвы. На самай раніцы ворагі атакавалі нашы лініі, зруйнаваные шасьцідзённым нішчучым агнём. Яны спаткалі сільны адпор і, панёсшы вялікіе страты, не маглі пасунуцца ўпярод. Толькі пасьля новай артылерыйскай падгатоўкі новы штурм с падмогай чысьленых панцырных самаходаў, кіраваны з заходу на Альман і с поўдня на Шовіньён, уварваўся ў нашы пазыцыі і дайшоў да паменёных вёсак. З гэтай прычыны нельга было удзержаць пазыцыі між гэтымі вёскамі. Забіраючы назад з гэтых ліній нашэ войска, прышлося ўзарваць нашы батарэі і пакінуць іх ворагам. Французы востра сьледам напіралі. С прычыны выступленьня нашых рэзэрв варожы націск быў задзержан пры Ціно, Во дэ Сон і Шовіньён, за каторые ішлі страшэные бітвы. Далейшых удач ворагі ня мелі.

Адначасова наабапол хутара Ля Руайер ішлі атакі некалькіх францускіх дывізій. Новые штурмы былі адбіты с самымі цяжкімі стратамі.

Пасьля доўгаго барабаннаго агня ворагі ў вечары пачалі штурм між Брэ і Ай. Двойчы паўторэны штурм густымі массамі зломлен зусім пад зашчытным агнём і ўвострай штыкавой бітве. Бітва трывала да познай ночы. Сягоньня раніцай яна нанова не пачыналася.

Нашы войскі біліся геройска.

Усходні тэатр:

Між рыжскай затокай і Дзьвіной начамі да 22 кастр. мы без прашкод са стараны ворагоў адцягнулі назад высунутые часьці войск на галоўные пазыцыі.

Македонскі фронт: Жывая артылерыйская бітва на заходзі ад вазера Охрыда і ад Вардару да Дойрана.

Аустрыяцкіе апавешчэньня.

ВЕНА, 22.X. **Італьянскі тэатр:** Пры Монтэ Сіф мы ўдачна ўзарвалі варожы апорны пункт. У далінe Кордоволе мы ўварваліся на другую варожую лінію, ўчынілі ў ворагоў цяжкіе шкоды і вярнуліся назад с палоннымі.

---

18 кастрычніка нашы лятучые сілы ўдачна абкідалі бомбамі варожые марскіе сілы ў палудзенный часьці Адрыатыцкаго мора і шчасьліва вярнуліся назад.

Нямецкае наступленьне на Італію.

Главная-кватэра. 24.X. Баевая чыннасць у Тыролі, Карынтыі і на Ізонцо шмат узмацавалася. Нямецкая артылерыя далучылася да артылерыйскай баталіі. Нямецкая і аўстрыяцкая пяхота здабыла сягоньня раніцай пярэдніе італьянскіе пазыцыі пры Флічу, Тольмэйне і ў паўночнай часьці плоскагорыя Баінсіцца.

ВЕНА. (В.Т.Б.). 24.X. Сягоньня раніцай аўстрыяцкіе і нямецкіе войскі пачалі наступленьне на верхнім Ізонцо. Опэрацыі развіваюцца ўдачна. Шмат дзе здабыты першые варожые лініі. Узяты ўжо 6.000 палонных.

БЭРЛІН. (В.Т.Б.). 24.X. у вечары. На італьянскім фронці опэрацыі развіваюцца паводлуг пляну. Узяты ўжо некалькі тысяч палонных.

КАЛЯ ВАЙНЫ.

АФІНЫ. Міністэр заграгічных спраў заявіў у грэцкім парляменці: „Мір яшчэ не ля парога. Вайна будзе ешчэ доўга трываць і спыніцца не раней, чым вызваўшый сусьветную вайну мілітарызм ня будзе разгромлен".

ЛОНДОН. (Рэўтер). 22.X. Ллэйд Джордж сказау у Альбэртгольлю перад вялізарнай таўпой прамову, кажучы між іншым: „На ўсім кругазоры я ўсё ешчэ не бачу прадвесьнікоў трывалаго міра. Цяпер можна было бы дайсьці толькі дачэснаго замірэньня, каторае закончылося бы ешчэ больш страшэннай вайной. Дзеля будучыны чэлавечэства, трэба дайсьці ў гэтай вайне аканчацельнай развязкі. Цяпер Нямеччына магла-бы прыстаць на такі мір, каторы быў бы для яе карысны, а гэткі канец вайны падбіў бы ў будучыне тую ці іншую дзержаву пайсьці па яе сьлядох. Праўдзівы вораг цяпер— гэта ваенны дух, які паношыцца у Прусах. Расея, Сэрбія і Бэльгія зусім прыбіты да зямлі сілай Нямеччыны, каторая за час некольікіх людзкіх пакаленьнёў прыгатаўлялася да знішчэньня сваіх суседзёў.Сьвет ня дойдзе ні спакою, ні волі, пакуль гэты балван ня будзе разбіт, а яго жрэцы ня будуць пазбаўлены пашаны. Развал расейскай ваеннай сілы адцягнуў надзеі Англіі, але час — наш саюзьнік. Мы знаходзімся напярададні найважнейшай інтэрнацыональнай конфэрэнцыі, на якой будуць найбольш выдатные мужы саюзьнікоў, у тым ліку прэдстаўнікі новай расейскай дэмократыі. Крокі, якіе тамака будуць пастаноўлены, зробяць націск на ход вайны, а мо' і на яе развязку".

БЭРЛІН (В.Т.Б.). У верасьні падводнымі лодкамі затоплено ўсяго 672.000 тонн. Гэтак ад пачатку неаграніченай падводнай вайны да 1 кастрычніка затоплено ўсяго 6.975.000 тонн.

БЭРЛІН. (В.Т.Б.). У начы з 18 на 19 кастрычніка артылерыйскім агнём з нашых мінаносцаў затоплен пад Дюнкірхэнам англіцкі монітор.

ЛОНДОН. Англіцкі контр-мінаносец затануў. Выратаваны толькі 2 афіцэры і 21 матрос.

Памочны крэйсэр „Арама", 12.927 тонн, затоплен 12 кастр. торпэдаю.

БЭРЛІН. (В.Т.Б.). У паўночных водах ізноў затоплено 15 000 тонн.

БЭРЛІН. (В.Т.Б.). Новые ўдачы падводных лодак у канале Ляманш і ў Нямецкім моры: 3 параходы, 2 парусьнікі.

АБВЕСТКІ.

Друкавана у друкарні М. Кухты. **Выдавецтво «Гоман».** **Рэдактар Язэп Салавей.**